**УДК 821.161.3**

# НОВЫ ГЕРОЙ У БЕЛАРУСКІМ РАМАНЕ ПАЧАТКУ ХХ СТ. (ПА ТВОРАХ «СОКІ ЦАЛІНЫ» Ц. ГАРТНАГА І «ЗАПІСКІ САМСОНА САМАСУЯ» А. МРЫЯ)

***С.А. ВЯЛЮГА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***s.vialiuha@psu.by***

*Разглядаюцца раманы Ц. Гартнага «Сокі цаліны» і А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя», якія паказваюць уплыў на светапогляд і паводзіны герояў рэвалюцыйных падзей пачатку XX ст. на тэрыторыі Расійскай імперыі. Гэтыя падзеі выклікалі неабходнасць сацыялізацыі цэлых пакаленняў у абсалютна непрадказальную з практычнай кропкі погляду сістэму, але ў ідэалагічным плане заснаванай на жорсткай камуністычнай платформе. У рамане Ц. Гартнага герой актыўна падтрымлівае рэвалюцыю і новыя павевы, прымаючы ў іх непасрэдны ўдзел. У творы А. Мрыя герой-прыстасаванец, які выкарыстоўвае абставіны ва ўласных інтарэсах, падрываючы знутры саму сутнасць рэвалюцыйных пераўтварэнняў у краіне. Абедзве лініі паводзін былі характэрнымі для часоў дыктатуры пралетарыяту.*

***Ключавыя словы:*** *беларуская літаратура, новы герой, рабочы клас, гістарычны працэс.*

**Уводзіны.** Першая сусветная вайна і рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. – адны з самых крывавых канфліктаў першых дзесяцігоддзяў XX ст. Падзеі адбываліся на вялізнай тэрыторыі ад Атлантычнага да Ціхага акіянаў і ўцягнулі ў свой вір вялізную колькасць дзяржаў і мільёны жыхароў планеты, але найбольш цяжкія выпрабаванні выпалі на долю беларускага народа, які аказаўся ў самым цэнтры крывавага супрацьстаяння паміж дзяржавамі ў вайне, а потым у барацьбе паміж белымі і чырвонымі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Усё гэта не магло не адбіцца на паводзінах беларусаў, што і імкнуліся адлюстраваць у сваіх творах беларускія пісьменнікі і паэты.

**Асноўная частка.** У беларускай літаратуры пытанне новага героя было цесна пераплецена з раскрыццём тэмы рабочага класа. Менавіта ў рэвалюцыйна настроеным рабочым пісьменнікі ў нашай і іншых літаратурах перш за ўсё бачылі новага героя часу. Тэма рабочага класа, напоўненая глыбокім сацыяльным зместам, увайшла ў беларускую літаратуру разам з творчасцю Ц. Гартнага яшчэ да рэвалюцыі. Рабочы, які ўсведамляе сваю ролю ў гістарычным працэсе, узнімаецца на рэвалюцыйную барацьбу, стаў галоўным героем паэзіі Ц. Гартнага, а пераход да эпічнай прозы ўспрымаецца як заканамерны этап на шляху творчага росту пісьменніка, які адчуў небходнасць паказаць рабочага-рэвалюцыянера на шырокім гістарычным плане падзей, якія змянілі ход сусветнай гісторыі не толькі на пэўны прамежак часу, але і падзялілі дзяржавы на капіталістычны і сацыялістычны лагеры, якія ўступілі ў непрымірымае супрацьстаянне, што прывяло да Другой сусветнай вайны з яшчэ больш жахлівымі ахвярамі, чым папярэдняя.

Зварот Ц. Гартнага да жанру рамана адпавядаў і ўнутранай патрэбе развіцця беларускай прозы, якая яшчэ ў дарэвалюцыйны час шукала падыходы да эпічнага асэнсавання рэчаіснасці і чалавека ў ёй. Як адзначыў І. Навуменка, «пошукі героя, свядомага ўдзельніка рэвалюцыйнага змагання, з'явіліся для беларускай прозы адначасна і пошукам формы рамана» [2, с. 193]. У рамане «Сокі цаліны» гэтыя пошукі зліліся ў адно. Ц. Гартны выявіў сябе наватарам, калі асмеліўся на напісанне рамана, прысвечанага рэвалюцыйнай барацьбе рабочага класа.

Было б няправільна сцвярджаць, што да Ц. Гартнага не прадпрымаліся спробы раскрыць, асэнсаваць, паглыбіць тэму росту рэвалюцыйнай свядомасці рабочага класа. І Я. Купала, і Я. Колас, і Цётка, а таксама іншыя аўтары спрабавалі сябе ў раскрыцці гэтай праблематыкі, аднак часцей за ўсё яны праявіліся ў вершах, замалёўках, апавяданнях. Беларуская літаратура дарэвалюцыйнага перыяду адлюстравала працэс абуджэння грамадскай свядомасці чалавека, але ў ёй яшчэ не было вобраза рабочага-рэвалюцыянера. Першай такой спробай стаў Рыгор Нязвычны ў «Соках цаліны» Ц. Гартнага. Ствараючы гэты характар, пісьменнік у нейкай ступені аперажаў час, пракладваў дарогу новаму сацыяльна-псіхалагічнаму тыпу ў беларускай нацыянальнай літаратуры.

Раман «Сокі цаліны» адлюстроўвае творчыя пошукі Ц. Гартнага, эвалюцыю яго поглядаў. Задума і яе мастацкае ўвасабленне звязаны, перш за ўсё, з уяўленнем пісьменніка свайго героя, з пэўным эстэтычным ідэалам, з мастацкай канцэпцыяй чалавека, якая ў канчатковым выніку і «абумоўлівае асаблівасці ўсёй сістэмы вобразаў твора, яго жанрава-кампазіцыйную адметнасць, яго стыль» [3, с. 10]. Новы герой у асобе рабочага-рэвалюцыянера бачыўся Ц. Гартнаму (як, дарэчы, і многім іншым пісьменнікам у 1920-я гг.) як з'ява выключная (адсюль пэўная зададзенасць вобраза, яго ідэалізацыя). Такі герой, на думку пісьменніка, павінен быў выявіць сябе перш за ўсё ў дзеянні, таму ў творы назіраецца павышаная ўвага да знешняга дзеяння і пэўнае ігнараванне яго псіхалагічнай матывіроўкі. Задума стварыць гераічны характар героя актыўнага рэвалюцыйнага дзеяння, безумоўна, прадугледжвала паказ эвалюцыі перса-

нажа, таму твор ахоплівае значны адрэзак часу, насычаны важнымі гістарычнымі падзеямі, на фоне якіх і ў сувязі з якімі адбываецца станаўленне галоўнага героя. Пісьменнік імкнецца да эпічнасці ў яго абмалёўцы. Паводле аўтарскай задумы рабочы-рэвалюцыянер як пераўтваральная сіла гісторыі павінен быць паказаны ў шматлікіх сувязях са светам, у суаднесенасці з гістарычнымі і маральнымі праблемамі свайго часу. У рамане Ц. Гартнага «Сокі цаліны» ўпершыню ў беларускай літаратуры вобраз рабочага-рэвалюцыянера «даваўся з бытавой, маральнай, духоўнай і палітычнай біяграфіяй» [4, с. 80].

У першай частцы рамана «Бацькава воля» намеціўся шматпланавы паказ героя. Пісьменнік прасочвае лінію сацыяльнага паходжання Нязвычнага, паказвае яго ў адносінах да маці, каханай, таварышаў, раскрывае яго чалавечую сутнасць праз сувязь з прыродай, у працы, выяўляючы тым самым розныя рысы характару. Праз плынь думак пісьменнік перадае псіхалагічны стан героя, раскрываючы яго «знутры». Перадача асабістых перажыванняў надае вобразу Нязвычнага індывідуальную непаўторнасць, робіць яго па-чалавечы зразумелым. «Сапло прыемнай свежасцю. У Рыгора васкрослі ўспаміны дзіцячых гадоў, тае пары, калі ён з другімі хлопцамі-таварышамі, малыя і распусныя яшчэ, кралі бручку з гародаў, зрывалі мак і шчаўе… Так бывала летам, калі ўсё спела. А вясною, чуць толькі паказвалася цяпло, пачынаў раставаць снег, часцей выблісквала сонца, Рыгор з хеўраю сваіх таварышоў кожную нядзелю бегалі ў хвойнік і шукалі ў ім голых мясцін зямлі; дзе знаходзілі – разуваліся і ступалі босымі нагамі» [1, с. 109].

Рыгор адчувае сапраўдную асалоду, калі бярэ ў рукі касу, калі ходзіць за плугам. Яго хвалюе знаёмая з дзяцінства стыхія сялянскай працы, радуе вока выгляд жыта. Хораша і паэтычна перадае пісьменнік пачуцці персанажа ў такія моманты. Разам з тым, у «Бацькавай волі» іншы раз назіраецца неадпаведнасць паводзін і выказванняў героя логіцы развіцця яго характару. Відаць, гэта звязана з тым, што гэтая частка рамана мае дзве рэдакцыі [5, с. 320] (першая напісана ў 1914 – 1916 гг., а другая – у канцы 20-х, пачатку 30-х гг.), істотная розніца паміж якімі заключаецца ў трактоўцы вобраза Рыгора Нязвычнага. У першай рэдакцыі ён быў створаны як рабочы-пакутнік, чалавек з вельмі нізкім сацыяльным статусам, а ў другой Ц. Гартны надае свайму персанажу рысы, якія павінны былі фарміравацца паступова на працягу ўсяго рамана.

Нязвычны ўжо вызначаецца шырынёй погляду на свет, на ролю працоўнага народа і на сябе, як на актыўнага ўдзельніка тых гістарычных зрухаў, што адбываліся ў першай чвэрці XX ст. У сувязі з гэтым ускладнялася задача пісьменніка ў выкарыстанні ўсяго комплексу новых мастацкіх сродкаў, бо ў 2-й, 3-й, 4-й частках рамана Рыгор Нязвычны паказаны ў абставінах, якія істотна адрозніваюцца ад тых, што адлюстраваны ў 1-й частцы твора. Як адзначыў В.П. Жураўлёў, «задумай вымагалася на шырокім фоне грамадскіх і гістарычных падзей паказаць духоўны і палітычны рост рабочага – фігуру у беларускай літаратуры па-сутнасці новую. Традыцыйная сістэма выяўленчых сродкаў і традыцыйнасць самой мастацкай формы, што больш ці менш маглі адпавядаць матэрыялу сялянскай тэматыкі ў першай кнізе рамана «Сокі цаліны», у далейшым патрабавала сур'ёзных змен, бо круты паварот рабіла аўтарская задума. Пісьменнік адчуваў гэта і прыклаў пэўныя намаганні, накіраваныя на абнаўленне мастацкай палітры, жанравай і сюжэтна-кампазіцыйнай структуры» [8, с. 150].

Герой Ц. Гартнага з'уляецца ўдзельнікам барацьбы пралетарыяту за марксісцка-ленінскія ідэалы ў Пецярбургу, Рызе і Мінску. Этапы гэтай барацьбы – этапы палітычнага і духоўнага росту героя. Нязвычны праходзіць праз многія выпрабаванні, якія загартоўваюць яго волю і ўмацоўваюць веру ў справядлівасць рэвалюцыйных ідэалаў. Дзе б ні знаходзіўся герой рамана, ён прымае самы актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе. Прага барацьбы дамінуе ў ім над іншымі жаданнямі. Разам з тым перабольшванне ролі сацыяльнай прыналежнасці да пралетарыяту з'яўляецца прычынай схематызму і просталінейнасці, у выніку якой неардынарнасць яго паварочваецца спрашчэннем складанай чалавечай прыроды. Адзін з герояў рамана, а разам з ім і сам аўтар, лічаць, што галоўны герой ужо цалкам падрыхтаваны да выкананання вельмі высокай і адказнай функцыі – «вучыць, а не вучыцца» [1, с. 222]. З гэтай кропкай погляду можна пагадзіцца, калі адштурхоўвацца ад марксісцкага палажэння пра тое, што рабочаму класу належыць вядучая роля ў гістарычным рэвалюцыйным пераўтварэнні дзяржаўных сістэм ва ўсім свеце. Але адназначна можна сцвярджаць, што прыналежнасць да рабочага класа не гарантуе яе прадстаўнікам высокі ўзровень духоўнасці і светаразумення.

У заключных частках твора пісьменнік паказвае чытачам Нязвычнага, які ў многім адрозніваецца ад таго героя, якога яны бачылі ў пачатку рамана, бо эвалюцыя Рыгора відавочная. Яна выяўляецца праз пачуцці і думкі, што сведчыць пра тыя якасныя змены, якія адбыліся ўнутры яго самога. Але паранейшаму ён апантаны рэвалюцыйнай барацьбой, захапляецца маштабамі і значнасцю падзей. Пачатую Ц. Гартным тэндэнцыю паказу героя новага часу падхапілі іншыя беларускія пісьменнікі. Тэму рэвалюцыі і ролю рабочага класа ў ёй распрацоўвалі Р. Мурашка, М. Лынькоў, Хв. Шынклер і інш.

Але ў беларускай і рускай літаратурах рэвалюцыйныя і паслярэвалюцыйныя часы паказаны не толькі са станоўчага боку, але і ў сатырычным плане, бо прадстаўнікі аднаго і таго ж пакалення па-рознаму ўспрынялі магчымасці, якія адкрыла рэвалюцыя для прадстаўнікоў рабочага класа і сялянства. У рускай літаратуры гэта «Катлаван» А. Платонава, «Сабачае сэрца» і «Майстар і Маргарыта» М. Булгакава і інш., а ў беларускай літаратуры раман «Запіскі Самсона Самасуя» А. Мрыя, які з'яўляецца адным з самых арыгінальных сатырыч-

ных твораў 1920-х гг. Гэты твор можна назваць узорам сацыяльнага і палітычнага прадбачання. Ён напісаны ў форме дзённіка галоўнага героя, які крочыць па жыцці самаўпэўнена, з адчуваннем свайго поўнага права гвалтоўна перайначыць усё, што трапляе ў поле яго дзейнасці і не толькі, але такая рыса была тыповая для тых, хто ажыццяўляў «справядлівую» рэвалюцыйную ідэю.

Вобраз Самсона Самасуя, увогуле, неяк не ўпісваецца ў тыповы вобраз памяркоўнага беларуса. Так, Самсон, як і «самасуеўшчына», – гэта ўродлівае стварэнне, якое народжана кастрычніцкімі падзеямі 1917 г. З самага пачатку рамана пісьменнік звязвае асобу свайго антыгероя, яго бязглуздую дзейнасць на пасадзе культработніка з сацыяльна-палітычнымі абставінамі, атмасферай жыцця ўжо ў канцы 1920-х гг. паслярэвалюцыйнага часу. Самасуй правільна схоплівае асноўны кірунак дзейнасці мясцовай улады і, як і Шарыкаў з «Сабачага сэрца», свае намаганні прыкладае на разбурэнне ўсяго «старога», адкідваючы ўсе няпісаныя, гэта значыць маральныя, законы чалавечай супольнасці, як непатрэбнае. Чалавечая асоба ў гэтым рэвалюцыйным будаўніцтве каштоўнасці не мае, нічога не значыць, чалавечых правоў не існуе, а ёсць законы класавай барацьбы. І, зразумела, рэвалюцыйная ўлада ўсё гэта падтрымлівала.

Па сутнасці аб’ектам сатырычнага выкрыцця ў рамане з’яўляецца антычалавечая палітыка і такая ж жыццёвая практыка, якія ўсталяваліся ў той час, заснаваныя на ігнараванні хрысціянскіх і маральных крытэрыяў і законаў. На гэтай глебе і ўзрастае такая сацыяльная з’ява, як «самасуеўшчына», з’ява сацыяльна небяспечная, якая прынесла ў наступстве грамадству вялікую шкоду. За гэтым бачны і аўтарская трывога за лёс беларускага грамадства, і аўтарскія маральна-эстэтычныя ідэалы – гуманізм, абарона чалавека ад падазроных эксперыментаў над яго жыццём і лёсам. У гэтым сэнсе Андрэй Мрый нібы зазіраў у заўтрашні дзень савецкага грамадства. Звяртаюць на сябе ўвагу шматлікія ўчынкі і метады Самасуя, якія шырока распаўсюдзіліся ў наступнае дзесяцігоддзе, у 1930-я гг., калі паклёпніцтва, даносы, здрадніцтва, масавыя рэпрэсіі сталі звычайнай прыкметай часу.

Сатыра ў творы «Запіскі Самсона Самасуя» стала сродкам аналізу рэчаіснасці. Пры дапамозе яе ствараецца аўтарская мастацкая канцэпцыя свету, у аснову якой пакладзены спрадвечныя агульна-чалавечыя каштоўнасці. Сярод сродкаў аналізу важнейшае месца займаюць моўна-стылёвыя. Са стыляў анкет, дакладаў, пратаколаў, характарыстык, даведак, газетнай агітацыі ствараецца сплаў гэтых элементаў, напоўненых гумарам. Мова героя выступае як элемент самахарактарыстыкі, бо ён ужо так засвоіў пратакольна-анкетна-газетны стыль, што па-простаму, без штампаў, выражацца не можа, напрыклад, «пасьля малёнага змаганьня з сваім тэмпэрамэнтам вынес рэзалюцыю» [6, с. 16], «зь неаслабнай энергіяй вёў сваю амурную лінію» [6, с. 29] (аб заляцаннях да дзяўчыні), «бачачы мае электрафікаваныя вочы» [6, с. 31] (так глядзіць на дзяўчыну), «можаце і мяне каапгаваць у склад цёплай кампаніі» [6, с. 23] (аб далучэнні да маёўкі). Ён нават спрабуе ўпісацца ў гісторыю калі не краіны, дык хоць мясцовую. У галаве Самасуя здарыўся такі зрух, што ён забыўся пра ўсё, чаму яго вучылі ў дзяцінстве і юнацтве бацькі. Не толькі важнае і няважнае, але дабро і зло нібы памяняліся месцамі, стаў немагчымы цвярозы, разумны погляд на рэчы і на самога сябе.

Уся тая бескарысная дзейнасць, якую з неўтаймаванай энергіяй і напорыстасцю разгортваў Самсон Самасуй у Шапялёўцы, не можа мець ніякага станоўчага выніку, бо ўсё, што і як ён робіць супярэчыць здароваму сэнсу. Гэта і «сонечная кампанія» [6, с. 58] і змена назваў вуліц (Вуліца вызваленьня жанчыны ад пялюшак [6, с. 73]), і арганізацыя паказальнага навукова-мастацкага музея, тэатра [6, с. 68], і дыспут з архірэем і «божымі дзецьмі» [6, с. 76], і стварэнне навуковага таварыства [6, с. 78]. Мэта ўсёй валтузні Самсона была адна – каб на яго звярнула ўвагу начальства, а вынікі працы ніхто не ўлічваў, пра іх ніхто не пытаўся. Калі што не выйшла ці дало адмоўны вынік, як, напрыклад, стаптаныя палі і сенажаці ў час «сонечнай кампаніі», дык ніхто, тым больш ініцыятар, адказнасці не панёс ні перад сялянамі, ні перад уладай, бо гэта ж важная дзяржаўная справа.

**Заключэнне.** Творы Ц. Гартнага і А. Мрыя з’явіліся значнай вехай у развіцці маладой беларускай літаратуры і ўваходзе яе ў савецкую літаратуру як дастойнага прадстаўніка нацыянальнай культуры, літаратуры і мастацтва. Палітычныя рэпрэсіі 1920 – 30-х гг. практычна вынішчылі беларускую інтэлігенцыю, а стварэнне пісьменніцкіх саюзаў савецкіх рэспублік і аб’яднанне іх у Саюз пісьменнікаў СССР прывяло да жорсткай палітычнай цэнзуры. Спалоханы пагрозай быць рэпрэсіраваным А. Мрый уласнаручна знішчыў працяг свайго твора. Разам з гэтым развіццё беларускай літаратуры не спынілася, бо на творчым вопыце ўжо названых літаратараў, а таксама Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, К. Чорнага і іншых, у ёй з’явілася шмат новых пісьменнікаў, творы якіх перакладзены на многія мовы свету.

ЛІТАРАТУРА


1. Гартны, Ц. Сокі цаліны: раман: у 4 квадрах / Ц. Гартны; уступ. артыкул А. Адамовіча. – Мінск : Дзяржвыдавецтва БССР, 1957. – Т. 1. – 480 с.
2. Навуменка, І. Я. Якуб Колас: Духоўны воблік героя / І. Я. Навуменка. – 2-е выд., дап. і перапрац. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1981. – 238 с.

3. Жулинский, И. Г. Человек в литературе. Общественные ценности и проблема художественного характера / И.Г. Жулинский. – Киев : Наук. думка, 1983. – 303 с.
4. Каваленка, В. Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы: Агульны рух і галоўныя тэндэнцыі / В. Каваленка, М. Мушынскі, А. Яскевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 348 с.
5. Гаранін, Л. Я. Нараджэнне новага мастацтва : сацыялістычны рэалізм – заканамернасць гістарычнага развіцця беларускай літаратуры / Л. Я. Гаранін, А. С. Яскевіч, А. П. Матрунёнак. – Мінск Навука і тэхніка, 1980. – 326 с.
6. Мрый, А. Запіскі Самсона Самасуя : аповесць / А. Мрый. – Мюнхэн : Бацькаўшчына, 1953. – 88 с.
7. Лыч, Л. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў: дэградацыя і адраджэнне / Л. Лыч // Літаратура і мастацтва. – 1990. – № 15–17.
8. Жураўлёў, В. П. Структура твора: Рух сюжэтна-кампазіцыйных форм / В. П. Жураўлёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 152 с.

*Пастуліў 20.12.2019*

## NEW CHARACTER IN BELARUSSIAN NOVEL OF THE EARLY XX$^{th}$ CENTURY (ON T. GARTNY'S *VIRGIN LAND JUICES* AND A. MRIY'S *SAMSON SAMASUI'S NOTES*)

***S. VIALIUHA***

*The article analyzes* Virgin Land Juices *by T. Gartny and* Samson Samasui's Notes *by A. Mriy. The novels show how the revolutionary events of the early XX$^{th}$ century on the Russian Empire territory influenced the world view and the behavior of their participants. From a social point of view, these events necessitated the socialization of several generations into a completely unpredictable system, ideologically based on a rigid communist platform. In T. Gartny's novel the character actively supports the revolution and new trends taking them directly. As far as the A. Mriy's work is concerned, the character is a timeserver who uses circumstances for personal gain undermining the essence of the revolutionary transformations in the country. Their behavior is typical for the period of dictatorship of the proletariat.*

***Keywords:*** *Belarusian literature, new hero, working class, historical process.*